УДК 94(47).07:070

# ПРАБЛЕМА ЯЎРЭЙСКАГА ЗЕМЛЯРОБСТВА НА СТАРОНКАХ ВЫДАННЯ «РУССКИЙ ЕВРЕЙ»

Таляронак Кацярына Аляксандраўна
выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»
(г. Полацк, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны праблеме яўрэйскага земляробства ў Расійскай імперыі, якая заняла прыкметнае месца на старонках выдання яўрэйскай рускамоўнай газеты «Русский еврей». У артыкуле разглядаюцца публікацыі 1879 года розных аўтараў, прадстаўнікоў руска-яўрэйскай інтэлегенцыі. Праводзіцца аналіз поглядаў і падыходаў тагачасных публіцыстаў да вырашэння яўрэйскага аграрнага пытання, узгадваюцца прычыны дарэмнасці палітыкі царскага ўрада па стварэнню катэгоры яўрэяў-земляробаў у Паўночна-Заходнім і Паўднёвым краі.*

Так гістарычна склалася, што расійскае грамадства XIX стагоддзя ўспрымала яўрэйскае насельніцтва мяжы аселасці выключна як рамесна-гандлёвае саслоўе, а да эксперыменту з яўрэйскімі земляробчымі калоніямі ставілася як да дарэмнай, беспасяховай справы. Некаторая частка палітычных і грамадскіх дзеячоў выводзілі прычыны адстунасці яўрэяў у складзе сялянскага саслоўя, напрыклад, з іх рэлігіі. П.І. Пестэль, які некаторы час служыў у арміі на тэрыторыі Заходніх губерняў, адлюстраваў у тэксце «Русской Правды» уласныя назіранні за яўрэйскім этнасам мяжы аселасці: «Ожидая Мессию, щитают себя евреи временными обывателями края, где находятся, и потому никак не хотят земледелием заниматься, ремесленников даже отчасти презирают и большею частью одною торговлею занимаются» [1, с. 51].

Імкненне расійскага ўрада зрабіць яўрэйскае насельніцтва сялянскім стала важнай задачай вырашэння «яўрэйскага пытання» і прыкметным накірункам нацыянальнай палітыкі ў цэлым. Падцверджаннем гэтаму з'яўляецца цікавасць да праблемы яўрэйскага земляробства сярод руска-яўрэйскай інтэлегенцыі Расійскай імперыі.Асобны раздзел яўрэям і земляробству быў прысвечаны на старонках штотыднёвай рускамоўнай газеты «Русский еврей». Гэта друкаванае выданне выходзіла ў тагачаснай сталіцы Расійскай імперыі горадзе Пецярбургу ў перыяд з 1879 па 1884 гады. Выдаўцом штотыднёвіка спачатку быў яўрэй Л. Берман, а потым яго змяніў Г. Рабіновіч [2]. Пачынаючы з моманту функцыянавання газеты артыкулы аб яўрэйскім земляробстве займаюць важкае месца ў раздзеле газеты «Передовые статьи».

Актыўна на вызначаную праблему ў гэтай газеце друкаваўся юрыст, выхадзец з Беларусі Віталь Восіпавіч Леванда. Ён нарадзіўся ў 1840 годзе ў Мінску. У 1872 годзе В.В. Леванда надрукваў артыкул «К вопросу о земледелии у евреев в России» у шматтомным выданні «Еврейская библиотека», пасля чаго па даручэнні барона Г.В. Гінцбурга склаў вядомы «Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев, от уложения царя Алексея Михайловича до настоящего времени, 1649–1873. Извлечение из Полных собраний законов Росс. Империи» [3]. Першы яго артыкул аб яўрэях земляробах у газеце «Русский еврей» з'явіўся ў верасні 1879 года, працяг тэмы быў надрукаваны ў кастрычніку гэтага ж года. У сваіх артыкулах аўтарпадтрымлівае палітыку царскага ўрада па стварэнню яўрэйскіх земляробчых калоній ў Паўднёвым і Паўночна-Заходнім краі, вылучае крытэрыі паспяховасці яўрэйскага земляробства, да якіх ён аднёс вопыт, наяўнасць спецыяльнай адукацыі, дастаковы памер зямельнага надзела і добрая яго якасць. Цікавым з'яўляецца прыведзены В. Левандай румынскі вопыт, дзе са слоў аўтара «румынцы боятся превращения евреев-торгашей в земледельцы», так як яўрэйскі этнас здольны запаланіць любую сферу жыццядзейнасці, да якой атрымлівае прававы доступ [4, с. 103–107]. Ідэю аб «природной даровитости» яўрэйскага народа да любой справы аўтар працягвае ў 9 нумары «Русского еврея» і заклікае яўрэйскае насельніцтва мяжы аселасці да таго, каб яўрэйскае земляробства паўтарыла шлях яўрэйскай адукацыі, гэта значыць набыло папулярнасць і актыўна распаўсюджвалася ў яўрэйскім асяродку [5, с. 300–303].

У шостым нумары газеты В. Леванда прадпрымае спробу аналізу няўдач яўрэйскага земляробства ў Расійскай імперыі, разважае аб гістарычных прычынахнепапулярнасці земляробства сярод яўрэяў. Асаблівую ўвагу прыцягваюць прапанаваныя на старонках газеты праекты па вырашэнню яўрэйскага земляробчага пытання. Даследчык сцвярджае, што працэс далучэння яўрэяў да земляробства не можа працякаць хуткімі тэмпамі: «Нельзя в одно утро превратить еврея в хлебопашца» [6, с. 183]. Ён прапаноўваў стварыць вучэбныя земляробчыя фермы для яўрэйскіх дзяцей, каб сфарміраваць маладое пакаленне яўрэяў-земляробаў Расійскай імперыі. Звяртае на сябе ўвагу ўзгаданы юрыстам закон развіцця культур, згодна якому земляробства стаіць на ўзровень ніжэй гандлёвай справы. Адсюль В. Леванда прыводзіць да высновы аб тым, што магчыма не варта звяртаць яўрэяў да сельскагаспадарчай справы [6, с. 183]. Таксама юрыст разважае на тэму яўрэйскай узаемадапамогі і вінаваціць яўрэяў у адсутнасці салідарнасці адзін да аднаго, прысвойваючы этнасу дэвіз «Sauve, quipeut!», што ў перакладзе з французскай мовы азначае «Ратуйся, хто можа!» [6, с. 185].

Яшчэ адным аўтарам па праблеме яўрэйскага земляробства на старонках «Русского еврея» стаў рускі публіцыст яўрэйскага паходжання А. Фірэр. У сваіх артыкулах ён разважае аб сталым пакаленні яўрэяў і іх здольнасцях да сельскагаспадарчай справы, не пагаджаецца з В. Левандай аб немагчымасці менавіта старэйшымпакаленнем яўрэяў займацца нязвыклай працай і прычыны няўдач яўрэйскага земляробства бачыць не толькі ў супярэчлівай палітыцы ўлад, але і ў «преследованиях и презрениях со стороны еврейских обществ». Аднак адзначае, што з цягам часу пагарда становіцца ўсё менш выразнай [7, с. 547]. Негатыўнае стаўленне да яўрэяў-земляробаў з боку кагала як фактар, які адмоўна ўплываў на станаўленне яўрэйскага земляробства ўзгадвае ў сваім грунтоўным даследаванні В.М. Нікіцін [8, с. 111]. Яго праца «Еврейские поселения северо и юго-западных губерний (1835–1890 гг.)» цалкам пабудавана на архіўных крыніцах і з'яўляецца на сёняшні дзень адзінай манаграфіяй па гісторыі яўрэйскіх земляробчых калоній на Беларусі. Аднак публіцыст А. Фірэр станоўча характарызуе яўрэйскі этнас і лічыць, што такія іх якасці як ашчаднасць, не гультайства, устрыманне ад п'янства спрыяюць развіццю ў іх гаспадарчых рысаў. Аўтар падрабязна апісвае праект стварэння вучылішча для земляробаў. Прапаноўвалася 2–3-гадовае навучанне для яўрэйскіх дзяцей бедных бацькоў, аднак з веданнем рускай мовы і арыфметыкі ва ўзросце 13–15 год. Пасля першага класа настаўнік-аграном павінен быў арганізаваць групу вучняў для працы па дамоўленасці на надзелах мясцовага землеўласніка і за невялікі заробак. Яўрэйскія вучні павінны былі за вызначаны тэрмін навучыцца касіць, жаць і малаціць зерне. Пасля другога і трэцяга гадоў навучання планавалася практыкавацца апрацоўцы зямлі адпаведнымі прыладамі працы [7, с. 549–550]. Так, на думку А. Фірэра, можна стварыць пакаленне сапраўдных яўрэяў-земляробаў, якія б паспяхова займаліся земляробствам у беларускіх і ўкраінскіх губернях мяжы аселасці.

Таксама трэба звярнуць увагу на 15 нумар газеты, які адчыняў артыкул без аўтарства пад назвай «Земледелие, арендаторство и землевладение у евреев». З упэўненасцю можна адзначыць адмоўнае стаўленне аўтара да палітыкі Расійскай імперы адносна яўрэйскага насельніцтва, што адлюстравана ў прыведзенай у артыкуле цытаце «Евреи не занимаются земледелием, избегают этого занятия и, следовательно, они паразиты, класс непроизводительный». Невядомы публіцыст прыпісвае аўтарства гэтай цытаты большасці расійскіх чыноўнікаў і бачыць прычыны адсутнасці сярод яўрэяў земляробчага класа ў тым, што зямля ў Расійскай імперыі належала прывілеяванаму класу, да якога яўрэі мяжы аселасці не мелі дачынення. Акрамя таго, надзелы апрацоўваліся прыгоннымі сялянамі, якімі яўрэі станавіцца не жадалі [9, с. 537]. Аднак, як адзначае аўтар, пасля адмены прыгоннага права, калі купля зямлі стала магчымай і не цягнула за сабой залежнасці, сярод яўрэяў узрастае колькасць землеўласнікаў, арандатараў і земляробаў [9, с. 540]. Фактычна, аўтарам прызнаюцца станоўчыя вынікі сялянскай рэформы 1861 года для яўрэйскага насельніцтва мяжы аселасці. Аднак відавочна, што якую б мадэль прыстасавання да новых палітычных умоў не абіралі яўрэі, гэта мадэль крытыкавалася чыноўнікамі і прызнавался ў пэўным сэнсе шкоднай для сацыяльна-эканамічнага становішча Паўднёвага і Паўночна-Заходняга края.

У цэлым, артыкулы на вызначаную тэматыку люструюць своеасаблівы погляд яўрэйскай інтэлегенцыі на іх адзінаверцаў,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

у якім выкрэсліваецца вобраз адмоўнага ўспрымання яўрэяў-земляробаў у яўрэйскім асяродку і імперскім грамадстве, падымаецца пытанне існавання пэўнага этнічнага стэрэатыпу. Асноўная ўвага руска-яўрэйскіх аўтараў «Русского еврея» звернута да палітыкі царскага ўрада, магчымыхшляхоўвыпраўлення памылак гэтай палітыкі і дакладныя прапановы па арганізацыі сістэмы сельскагаспадарчага навучання для яўрэйскага насельніцтва. Выразным становіцца сутыкненне двух поглядаў, якія яскрава падкрэсліваюцца ў артыкулах В. Леванды і А.Фірэра. В. Леванда і яго аднадумцы прытрымліваюцца погляду, што пры пэўных умовах толькі маладое пакаленне яўрэяў можа паспяхова асвоіць земляробчую практыку, прапагандуецца ідэя аб прыроднай даравітасці яўрэяў. А. Фірэр сцвярджае аб тым, што і сталыя яўрэі могуць паспяхова займацца земляробствам пры спрыяльных умовах.Так ці іначай, абодва лагеры аўтараў не адмаўляюць здольнасць яўрэяў да сельскагаспадарчай дзейнасці, падкрэсліваюць станоўчыя нацыянальныя рысы характару да гэтай справы. Праблема ўзаемадзеяння і ўзаемадапамогі паміж яўрэйскімі каланістамі займае важкае месца на старонках выдання, дзе часта гучаць абвінавачванні яўрэйскага насельніцтва ў адсутнасці салідарнасці. Гэты погляд ідзе ў разрэз з прадстаўленнямі аб яўрэях як народзе з высокай ступенню развіцця дабрачыннасці. Відавочна, што пры даследаванні вясковай гісторыі Беларусі нельга мінаць факт існавання саслоўя яўрэяў-земляробаў, статус якіх быў афіцыйна замацаваны расійскім заканадаўствам. І актуальнасць гэтай тэмы ў другой палове XIX стагоддзя падцвярджаецца ўвагай да гэтай праблемы аўтараў штотыднёвай газеты «Русский еврей».

### Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Пестель, П. И. Русская правда. Наказ Временному Верховному Правлению / П. И. Пестель. – СПб. : Книгоизд. «Культура», 1906. XII. – 245 с.
2. Гетманский, Э. Русско-еврейская периодическая печать и ее влияние на еврейскую литературу / Э. Гетманский // Заметки по еврейской истории. № 8–9 [Электронный ресурс]. – Режим доступа:http://litbook.ru/article/8437/. – Дата доступа: 15.09.2018.
3. Леванда Лев [Электронный ресурс] // Электронная еврейская энциклопедия. – Режим доступа: https://eleven.co.il/jewish-literature/in-russian/12346/. – Дата доступа: 20.09.2018.
4. Леванда, В. О. К вопросу о земледелии у евреев в России / В. О. Леванда // Русский еврей. – СПб. : Л. Берман, Г. Рабинович. – 1879. – 24 сент. – № 4. – С. 103–107.
5. Леванда, В. О. К вопросу о земледелии у евреев в России / В. О. Леванда // Русский еврей. – СПб. : Л. Берман, Г. Рабинович. – 1879. – 31 окт. - № 9. – С. 300–303.
6. Леванда, В. О. К вопросу о земледелии у евреев в России / В. О. Леванда // Русский еврей. – СПб. : Л. Берман, Г. Рабинович. – 1879. – 10 окт. – № 6. – С. 182–185.
7. Фирер, А. К вопросу о земледелии у евреев в России / А. Фирер // Русский еврей. – № 15. – 1879. – С. 545–550.
8. Никитин, В.Н. Еврейские поселения северо и юго-западных губерний (1835–1890 гг.) / В.Н. Никитин. – СПб.: Типолит. А. Е. Ландау, 1895. – 204 с.
9. Передовые статьи. Земледелие, арендаторство и землевладение у евреев // Русский еврей. – СПб. : Л. Берман, Г. Рабинович. – 1879. – 12 декаб. – № 15. – С. 537–544.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова